**УДК 82-343:82.09“19/20”**

***Іна Швед***
***Ірына Поўх***

# МІФ У ПОСТСТРУКТУРАЛІСЦКАЙ І ДЭКАНСТРУКТЫВІСЦКАЙ КРЫТЫЦЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ *

Артыкул прысвечаны праблеме інтэрпрэтацыі міфа як канцэпта і катэгорыі прадстаўнікамі постструктуралісцкай і дэканструктывісцкай крытыкі другой паловы XX – пачатку XXI ст. Абапіраючыся на працы Ж. Дэрыда, Р. Барта і іншых даследчыкаў, аўтары прасочваюць асноўныя падыходы да вызначэння міфа як тэкставай і пазатэкставай з’явы, узаемасувязі міфічнага і эпістэмалагічнага дыскурсу, міфалагічнага аналізу, размежавання міфа з навукай і іншымі наратыўнымі жанрамі. Сярод асноўных уласцівасцяў міфа як жанравай катэгорыі вылучаюцца адсутнасць адзінства альбо агульнай крыніцы, ацэнтрычнасць, немагчымасць вызначэння прадмета і аўтара міфічных тэкстаў і інш. Асобная ўвага надаецца прапанаванай Р. Бартам сістэме падыходаў да інтэрпрэтацыі міфа як тыпу маўлення, як семіялагічнай сістэмы, а таксама як формы і канцэпта.

**Ключавыя словы:** міф, постструктуралізм, дэканструктывісцкая крытыка, тэкст, дыскурс.

The article is dedicated to the problem of myth interpretation as a concept and a category in post-structuralism and deconstructivism criticism of the mid to late 20th – early 21st century. Having studied the works by Jacques Derrida, Roland Barthes and other researchers, the authors trace the main approaches to define the myth as a textual and extra-textual phenomenon, the relations between mythological and

* Праца выканана пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў у межах задання «Беларуская фалькларыстыка ў сучасным свеце: метадалагічны, праблемна-тэматычны дыяпазон, тэарэтычныя навацыі»; дамова № Г20У–004, нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20201112 ад 26.06.2020.

epistemological discourses, mythological analysis, as well as distinguish myths from science and other narrative genres. The main features of the myth as a genre category include the absence of uniformity or a common source, the acentric character, impossibility to define the author and the topic of myths etc. Special attention is paid to the R. Barthes' system of approaches to myth interpretation as a type of speech, a semiological system, or a form and a concept.

**Keywords**: myth, post-structuralism, deconstructivism criticism, text, discourse.

Станаўленне постструктуралісцкай – найперш, дэканструктывісцкай – крытыкі ў другой палове XX стагоддзя ўзбагачае еўрапейскую і амерыканскую гуманітарыстыку шэрагам новых напрамкаў даследавання, у першую чаргу, у галіне тэксталогіі. Дэканструктывісцкі падыход да тэксту будуецца на прынцыпах множнасці і шматстайнасці яго інтэрпрэтацый, адкрытасці да асэнсавання і пераасэнсавання, метафарычнасці як неад'емнай ўласцівасці любога тэксту, здольнасці любога тэксту выступаць асновай для стварэння бясконцага мноства новых тэкстаў, а таксама наяўнасці ў кожным тэксце самадэструктыўнага патэнцыялу, выражанага ў супрацьлеглых ідэях ці пазіцыях. Апошняе стварае эфект «невырашальнасці» тэксту, якая заўжды ўвасабляецца на металінгвістычным узроўні, не дазваляе падзяліць праблему тэксту на канчатковыя элементы, неабходныя і дастатковыя для яе вырашэння, і складае, у прыватнасці, адно з асноўных метадалагічных пытанняў вывучэння міфаў.

У артыкуле «Структура, знак і гульня ў дыскурсе гуманітарных навук» [4]. Ж. Дэрыда сцвярджае бясконцасць міфалагічнага аналізу, адсутнасць «патаемнага элемента», які раскрываецца ў працэсе дэкампазіцыі твора. Тэмы бясконца падзяляюцца і пераплятаюцца паміж сабой. У выніку, адзінства міфа як тэксту падаецца выключна ўяўнай з'явай, якая не адлюстроўвае пастаянныя альбо часовыя уласцівасці міфа, а выконвае выключна інтэрпрэтатыўную функцыю,

надае міфу сінтэтычную форму і папярэджвае яго распад на бясконцую колькасць неўпарадкаваных супрацьлегласцяў. Невыпадкова навукоўцы [4] характарызуюць міфазнаўства як «анакластычную» навуку ў найшырэйшым этымалагічным сэнсе гэтага тэрміна, як навуку, якая ахоплівае, апроч іншага, вывучэнне адлюстраваных і пераломленых промняў.

Міфалогію Заходняй Еўропы Ж. Дэрыда вызначае як «белую міфалогію» [3], створаную метафізікамі, чый алегарычны светапогляд абумоўліваецца імкненнем адысці ад апоры на знешняе, відавочнае і павярхоўнае. «Белая міфалогія», па сцверджанні Ж. Дэрыда, – гэта метафізіка, пазбаўленая фантастычнага асяроддзя, з якога выйшла, і ў той жа час не страчаная, жывая, глыбока метафарычная, запісаная белымі чарніламі, нябачны малюнак пад напластаваннямі палімпсесту. «Белая міфалогія» выступае ўвасабленнем культуры Захаду: белы чалавек разглядае ўласную (індаеўрапейскую) міфалогію як універсальную праяву розуму.

Адной з адметных уласцівасцяў міфа дэканструктывісты называюць адсутнасць адзінства альбо агульнай крыніцы. За аснову, ці выток, міфа бяруцца віртуальныя сутнасці. Яны няўлоўныя, іх немагчыма актуалізаваць, і яны не існуюць у аб'ектыўнай рэчаіснасці. Усё пачынаецца са структуры, складу і ўзаемасувязяў. Міф як дыскурс уяўляе сабой ацэнтрычную структуру, пазбаўленую асноўнай праблемы, ці цэнтра, перапляценне, перакрыжаванне і ўзаемасувязь адасобленых, замкнёных, ізаляваных, непарушных і недаступных прастор, праз якія праходзяць персанажы міфаў (Адысей, Уліс і інш.) падчас сваіх вандровак, паядноўваючы, падзяляючы і зноў паядноўваючы іх, што ўвасабляецца ў тэкстах праз вобразы далёкага вострава ці недасяжнай краіны, узбярэжжа, на якое выкідвае вандроўніка, і г. д. Драўляны конь з захопнікамі ўнутры ў цэнтры горада-крэпасці сімвалізуе адначасовую прысутнасць людзей, аддзеленых ад горада сценкамі

конскага корпусу, унутры гарадской прасторы і за яе межамі. Невідушчаць Цыклопа выступае сведчаннем рознага значэння замкнёнай прасторы для сляпога і відушчага чалавека. Падобным чынам, прыцягальная прастора вострава Сірэн будзе адкрытай (бяспечнай) для чалавека, пазбаўленага слыху, і закрытай (забароненай) для іншых [6].

Як сцвярджаюць даследчыкі, вывучэнне міфічнага дыскурсу патрабуе ўласнай тэрміналогіі, адрознай ад навуковага і філасофскага дыскурсу, адмаўлення ад патрабавання абавязковага звароту да вытокаў, цэнтру, асновы, сутнасці і г. д., стварэння т. зв. «міфамарфічнага» [4] дыскурсу, у супрацьвагу эпістэмалагічнаму. Ацэнтрычнасць міфічнага, ці міфалагічнага, дыскурсу стварае таксама метадалагічную праблему, абумоўленую немагчымасцю вырашэння асноўнай задачы шляхам падзелу яе на пэўную колькасць кампанентаў. Адсутнасць канчатковага элемента, да якога неабходна прыйсці ў выніку аналізу, робіць працэс даследавання міфа фактычна бясконцым. Акрамя адсутнасці цэнтра, дэканструктывісты звяртаюцца таксама да праблемы немагчымасці вызначэння прадмета і аўтара міфічных тэкстаў. Абвяргаючы сцверджанне, што вытокам сэнсу з'яўляецца тая ці іншая далінгвістычная альбо экстралінгвістычная з'ява, постструктуралісты аспрэчваюць пастулат, адпаведна якому пэўныя сюжэты лічацца першаснымі ў дачыненні да іншых, з вылучэннем аднаго «генеральнага» сюжэту, асноўнага для ўсіх іншых [1]. Адсутнасць адзінства альбо агульнай крыніцы лічыцца таксама адной з адметных уласцівасцяў міфаў.

Звяртаючыся да праблемы ўзаемасувязі міфічнага і эпістэмалагічнага дыскурсу, французскі філосаф Мішэль Сер сцвярджае немагчымасць размежавання наратыву, навукі і міфа. Даследчык адзначае, што навука не толькі не выключае міф, але ў пэўных выпадках і ўзбагачаецца ім, пашырае сферу свайго даследавання ў напрамках, якія першапачаткова

належалі міфу. Міф і навука не супрацьпастаўляюцца і не могуць выступаць рознаўзроўневымі элементамі іерархічнай структуры. Развіццё навукі і яе дасягненні непазбежна міфалагізуюцца, у той час як вынікі навуковых даследаванняў могуць скласці аснову новых міфаў. Адпаведна, міф як аповед найперш з'яўляецца формай перадачы, а не легендай паходжання – ён не сведчыць пра ўзнікненне навукі ці яе галіны, але даносіць да грамадскасці той ці іншы яе элемент [6].

Французскі філосаф, літаратуразнаўца і семіётык Ралан Барт вылучае тры асноўныя напрамкі інтэрпрэтацыі міфа: міф як тып маўлення, міф як семіялагічная сістэма, а таксама міф як форма і канцэпт [2]. Міф як тып маўлення ўяўляе сабой адначасова камунікатыўную сістэму і паведамленне, якое ў гэтай сістэме перадаецца. Міф, як сцвярджае даследчык, не можа быць аб'ектам, паняццем альбо ідэяй – гэта спосаб абазначэння. Уяўляючы сабой не змест паведамлення, а форму яго выражэння, міф мае выключна фармальныя абмежаванні. Адпаведна, міфам можа быць усё, што заўгодна, пры ўмове яго існавання ў адпаведным дыскурсе, пад якім Р. Барт разумее не толькі пісьмовы тэкст, але і любыя формы выразнасці – фотаздымкі, кіно, журналістыку, падзеі, імпрэзы і пад. Ні аб'ект, ні матэрыял не могуць з'яўляцца вызначальнай уласцівасцю міфа, бо любому матэрыялу можна надаць любы сэнс. Міф як тып маўлення складаецца з ужо апрацаванага матэрыялу, прыдатнага для далейшай камунікацыі: усе міфічныя матэрыялы ўяўляюць сабой спосаб выражэння свядомасці, стымул для далейшых разважанняў, незалежна ад яго зместу. Даследчык падкрэслівае, што міф як тып маўлення нельга атаясамліваць з мовай: хутчэй, ён належыць да семіялогіі – агульнанавуковай сферы, што існуе нароўні з лінгвістыкай (як фармальнай навукі), і ідэалогіі (як гістарычнай).

Ралан Барт вызначае міф як семіялагічную сістэму другога парадку, якая будуецца па трохаспектнай мадэлі – азначальнік, азначальнае і знак – і грунтуецца на створаным раней семіялагічным ланцужку. Знак (асацыятыўнае спалучэнне канцэпта і вобраза) зыходнай сістэмы ператвараецца ў азначальнік вытворнай – так, згаданыя вышэй матэрыялы міфічнага маўлення (мова, фотаздымак, малюнак, рытуал, прадмет і інш.), нягледзячы на ўсю сваю разнастайнасць, у міфічным дыскурсе выступаюць у якасці моўнага сродку і зводзяцца да азначальнай функцыі. Як выяўленчыя, так і пісьмовыя матэрыялы ператвараюцца міфам у комплекс знакаў, універсальны знак, канчатковы элемент першага семіялагічнага ланцужка, якому наканавана стаць першай часткай шырэйшай, створанай ім сістэмы. Адпаведна, міф паядноўвае ў сабе дзве семіялагічныя сістэмы: лінгвістычную («моўна-аб'ектную»), дзе мова (альбо прыроўненыя да яе спосабы рэпрэзентацыі) выступае асновай для стварэння новай міфічнай сістэмы, і ўласна міфічную, ці «метамоўную», якая апісвае першую.

Як адзначае фінскі фальклaрыст Фрог [5], развіццё семіятычных падыходаў адбывалася ва ўмовах асаблівай увагі тэарэтыкаў да ўзаемасувязі паміж міфам і мовай не таму, што міф разглядаўся як лінгвістычная па сваёй сутнасці з'ява, але таму, што мова выступае першаснай знакавай сістэмай, з дапамогай якой перадаюцца іншыя знакі. Падыход да міфа як да якаснага ўзроўню абазначэння абумовіў пераход ад сувязі слоў і аб'ектаў на ўзровень канцэптуальных катэгорый, якія абазначаюцца словамі. Новы напрамак мыслення прымусіў даследчыкаў перагледзець дэфініцыю міфа, акрэсліць межы яго вызначальных фактараў. Семіятычныя падыходы, заўважае Фрог, маюць на мэце не столькі аналіз непасрэдна наратываў, колькі пазнанне свету і інтэрпрэтатыўнае ўспрыманне досведу. Такія падыходы лічацца аптымальнымі для

вывучэння павер'яў, актуалізаваных у дыскурсах і практыках, у тым ліку ва ўласнай міфалогіі – найперш, тых яе аспектаў, якія не датычацца аповедаў. У прыватнасці, гэта датычыцца традыцый і супольнасцей, чыя міфалогія не абмяжоўваецца наратывамі, прысвечанымі апісанню тых ці іншых падзей міфічнага часу. З мэтай размежавання міфаў, аповедаў пра канкрэтныя сітуацыі з жыцця багоў, а таксама тлумачэнняў тых ці іншых падзей Фрог уводзіць канцэпты «цэнтралізаваных» і «дэцэнтралізаваных» сімвалаў. Да першай групы даследчык адносіць сімвалы, якія вылучаюцца ўнікальнай ідэнтычнасцю, супастаўляльнай з уласнымі імёнамі, тады як сімвалы другой групы шырока распаўсюджаны і ўжываюцца ў розных кантэкстах, як агульныя назоўнікі. Адпаведна, адзначаны падыход да вызначэння міфаў характарызуе іх як аповеды з уласнай ідэнтычнасцю («цэнтралізаваныя» сімвалы), перанесеныя ў шырокі кантэкст эмацыйна насычаных міфалагічных элементаў («дэцэнтралізаваныя» сімвалы) з усталяваннем розных тыпаў узаемасувязяў [5].

Нарэшце, інтэрпрэтацыя міфа як формы і канцэпта вынікае з яго здольнасці як азначальніка паядноўваць у сабе форму і змест, які Р. Барт атаясамлівае з функцыяй, альбо тэндэнцыяй. Канцэпт складаецца з шэрагу азначальнікаў і паўтараецца ў розных формах, што дазваляе даследчыкам расшыфраваць задуму міфа. Канцэпт, паводле Р. Барта, не з'яўляецца нязменнай адзінкай – канцэпты з'яўляюцца, змяняюцца, распадаюцца на больш дробныя і знікаюць. Канцэпт выступае складнікам міфа – каб расшыфраваць міф, неабходна ідэнтыфікаваць яго канцэпты [2].

У XXI ст. міф разглядаецца як цэнтральны канцэпт вывучэння сучаснай культуры. Фінскі фалькларыст Фрог [5] вызначае міф як фармалізаваную, сацыяльную ці іншую праекцыю «ўласнага» светапогляду на «іншыя» культуры. Сярод асноўных адметнасцяў міфа як катэгорыі даследчык

вылучае яе суб’ектыўны характар, а таксама наяўнасць выразна акрэсленай структуры з дакладна вызначаным цэнтрам. З вызначэння пэўнага наратыву як «міфа» звычайна вынікаюць бінарныя апазіцыі «мы» – «іншыя» і «праўда» – «няпраўда». Адпаведна, інтуітыўнае выкарыстанне тэрміна «міф» грунтуецца на падсвядомым супрацьпастаўленні ўласных сапраўдных ведаў і памылковых перакананняў «іншых», а сам канцэпт набывае адмоўнае канататыўнае значэнне ўяўнасці, несапраўднасці, аддаляючы даследчыка культуры «носьбітаў» міфаў ад аб’екта яго даследавання.

Фрог звяртаецца да прапанаванай яго папярэднікамі канцэпцыі «міфалогіі міфа» [4] як аповеду, прынцыпова адрознага ад сюжэтнага альбо тэарэтычнага тэксту; эстэтычнай рэпрэзентацыі, а не крыніцы інфармацыі; сімвалічнасці, а не факталогіі, тым самым супрацьпастаўляючы міф рэальным ведам. Адным з традыцыйных складнікаў канцэпта «міф», як адзначае Фрог, выступае сюжэт, які ўскосна характарызуе міф як нешта «іншае», адрознае ад сапраўдных ведаў, і супрацьпастаўляе аб’ектыўныя факты і падзеі эстэтычна ўпарадкаванай сімвалічнай рэпрэзентацыі [5]. Працяглая традыцыя вызначэння міфа як гісторыі, тыповая для розных культур, паўплывала на падыходы да яго вывучэння і крыніц.

Разнастайныя інтэрпрэтацыі міфа як тэрміна і канцэпта ў бытавым і акадэмічным дыскурсах паядноўваюцца наяўнасцю агульнай сацыяльнай асновы – уласцівага супольнасці, у межах якой ствараецца і бытуе міф, светапогляду, сістэмы каштоўнасцяў, уяўленняў пра навакольнае асяроддзе, яго арганізацыйную будову і паходжанне, мінулае і сучаснасць. Сацыяльны аспект міфа адрознівае яго ад фантазій і ілюзій – міфы не маюць універсальнага характару, яны заўжды належаць пэўнаму грамадству, культуры, рэлігіі альбо супольнасці. З гэтага Фрог вылучае два фундаментальныя аспекты міфа як канцэпта, на якіх грунтуюцца ўсе тэарэтычныя і аналітычныя

падыходы да яго інтэрпрэтацыі: міф як аповед і міф як тып мыслення. Гэтыя аспекты нярэдка спалучаюцца, але могуць разглядацца і паасобку.

Вывучэнне міфа як аповеду кладзецца ў аснову шэрагу дэфініцый і нярэдка выкарыстоўваецца ў якасці аксіёмы. Па сваіх фармальных прыкметах міф як наратыў вылучаецца простым для ўспрымання сюжэтам, адсутнасцю канатацый і інтуітыўна зразумелай ідэяй. Вызначэнне міфа як аповеду звужае сферу выкарыстання адпаведнага тэрміна, зводзячы аб'ект даследавання выключна да корпусаў тэкстаў. Сярод недахопаў адзначанага падыходу Фрог вылучае таксама той факт, што міфы нярэдка выконваюць у культурных кантэкстах функцыю працягу гісторыі і ўспрымаюцца не як аповеды, а як падзеі, што маглі мець месца да ці пасля ўсталявання сучаснага грамадскага ладу. Адпаведна, яны ўяўляюць сабой катэгорыю ведаў, якія не адпавядаюць супрацьпастаўленню гісторыі як сапраўдных падзей і міфа як выдуманых. Размежаванне аповеду і падзеі не мае эпістэмалагічнага характару: аповед уяўляе сабой дыскурс, тады як падзея ўвасабляе рэчаіснасць па-за яго межамі. Тым не менш, наданне перавагі аднаму з гэтых аспектаў не дазваляе разглядаць міф у розных кантэкстах. Так, інтэрпрэтацыя міфа як аповеду аўтаматычна выключае з катэгорыі міфаў аб'екты, якія не маюць наратыўнага характару. Акрамя таго, як адзначае Фрог, існаванне падзей па-за дыскурсам дазваляе ім утвараць складаныя сеткавыя структуры, тады як аповед мае лінейную арганізацыю, ствараючы сюжэт з завязкай, кульмінацыяй і развязкай. Адпаведна, абмежаванне логікі арганізацыі міфічных падзей лінейным сюжэтам аўтаматычна выключае міф з кантэксту замоў, рытуалаў і пад.

З вывучэння міфа як наратыву вынікае таксама праблема размежавання наратыўных жанраў, у прыватнасці міфаў, легенд і казак як традыцыйных тыпаў аповеду. Вылучэнне міфа

ў якасці асобнага жанру залежыць ад інтэрпрэтацыі самой катэгорыі жанру. Двухаспектны падыход, які грунтуецца на супрацьпастаўленні формы і зместу, дазваляе фармальна інтэрпрэтаваць міф як аповед, лагічна арганізаваную паслядоўнасць узаемазвязаных падзей. З пункту погляду зместу, такі аповед можа належаць свету звышнатуральнага на ўзроўні персанажаў (багі, міфічныя істоты), альбо месца і/або часу дзеяння. Фрог прапаноўвае таксама чатырохаспектны падыход да інтэрпрэтацыі міфа як жанру, які ахоплівае наступныя аспекты: форма, змест ці выкананне (які сацыяльны ці звышнатуральны эфект мае на мэце), практыка (хто звычайна выконвае, у якіх абставінах), і функцыі (уплыў на грамадства і ўзаемасувязь з іншымі жанрамі і формамі выразнасці) [5].

Праведзены аналіз навуковых прац прадстаўнікоў постструктуралісцкай і дэканструктывісцкай крытыкі сведчыць, што інтэрпрэтацыя міфа як канцэпта і катэгорыі ахоплівае розныя формы выразнасці, прычым асноўная ўвага надаецца вывучэнню механізмаў прэзентацыі і перадачы міфаў як сімвалаў на лінгвістычным і / або пазалінгвістычным узроўні. Міф як асобны фальклорны жанр уяўляе сабой комплекс знакаў, прыдатных для перадачы моўнымі сродкамі. Міф выступае адной з крыніц навуковых ведаў, папярэднічае ім і вызначае гісторыю іх станаўлення і развіцця. Дэканструяванне традыцыйных і сучасных падыходаў да інтэрпрэтацыі тэрміна «міф» парушае «міфалогію міфа», дапамагае пазбавіцца прадузятасці і тэндэнцыйнасці ў яго вывучэнні, а таксама распрацаваць новую дэфініцыю міфа, што зробіць адпаведны тэрмін нейтральным і, у выніку, больш эфектыўным, інструментам даследавання.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ / REFERENCES*

1. ARMSTRONG, Nancy, Leonard TENNENHOUSE. History, Poststructuralism, and the Question of Narrative. *Narrative*, 1993, vol. 1, no. 1, pp. 45–58 [in English].

2. BARTHES, Roland. *Mythologies.* New York, 1972 [in English].

3. DERRIDA, Jacques, Francis Charles Timothy MOORE. White Mythology: Metaphor in the Text of Philosophy. *New Literary History*, 1974, vol. 6, no. 1, pp. 5–74 [in English].

4. DERRIDA, Jacques. *Writing and Difference*. Chicago, 1978 [in English].

5. FROG, Mr. Myth. *Humanities*, 2018, vol. 7, no. 1, pp. 14–53 [in English].

6. SERRES, Michel. *Hermes: Literature, Science, Philosophy*. Baltimore, 1982 [in English].

## *SUMMARY*

The article is dedicated to the issue of myth interpretation as a concept and a category in post-structuralism and deconstructivism criticism of the mid to late 20th – early 21st century. Having studied the works by Jacques Derrida, Roland Barthes and other researchers, the authors trace the main approaches to define the myth as a textual and extra-textual phenomenon, the relations between mythological and epistemological discourses, mythological analysis, as well as distinguish myths from scholarly knowledge and other narrative genres. The research has shown that the main features of the myth as a genre category include the absence of uniformity or a common source, the acentric nature, non-definability of the author and the topic etc. Addressing the deconstructivism approach to the study of myth, the authors emphasize its infinity, the absence of the so called "secret element" discovered in the course of textual decomposition, as well as the large number of interweaving themes. Special attention is paid to the R. Barthes' system of approaches to myth interpretation as a type of speech, a semiological system, or a form and a concept.

The second part of the article covers the myth studies in the early 21st century. It has been discovered that the scholars of the indicated period regard the myth as a central concept in modern cultural studies, a formal, social or any other projection of an individual's "own" philosophy into "foreign" cultures. Referring to a Finnish researcher Mr. Frog, the

authors concentrate on the following aspects of myth studies: myth as a term and a concept in popular and academic discourses, myth as a narrative, and the "mythology of myth".

The authors have concluded that in post-structuralism and deconstructivism criticism myth as a concept and a category takes various forms of expression, with particular regard to presentation and transmission mechanisms for linguistic and / or extra-linguistic symbolic nature of myths. As a distinct genre of folklore, myth is a set of symbols translatable into speech. It also serves as a source of scholarly knowledge, preceding the latter and defining the formation and development therefore. Deconstruction of traditional and modern approaches to myth interpretation subverts the "mythology of myth", prevents prejudiced or biased approach to myth studies, and creates a new definition of myth, turning it into a neutral and therefore more efficient research instrument.

**Keywords**: myth, post-structuralism, deconstructivism criticism, text, discourse.